УДК 882. 6 – 1

*Ж.С. ЦЕРАХАВА*

# УВАСАБЛЕННЕ ВЕТРУ, БУРЫ, ВІХУРЫ Ў ЛІРЫЦЫ У.ЖЫЛКІ

Прырода ў творчасці Уладзіміра Жылкі, як і іншых паэтаў 20 – 30-х гадоў XX стагоддзя, выступае актыўнай дзеючай сілай, яна знаходзіцца ў вечным абнаўленні, руху, развіцці. У творах аўтара яна жывая, рухавая, зменлівая, па настроі часцей засмучоная, слёзная, злая, трывожная, хоць часам бывае радаснай, вясёлай. Сустракаем толькі адзінкавыя пейзажныя вершы, з якіх вее своеасаблівай цеплынёй і спакоем: «Летні вечар», «Восень» (1925)[1], «Пралескі», «Насоўвае пушча...». Гэта акалічнасць не з'яўляецца выпадковай, бо перавага змрочных фарбаў над светлымі адпавядала рэальнаму тагачаснаму жыццю. Ужо ў ранніх вершах паэта адчуваецца ўплыў вуснай народнай творчасці, адкуль чэрпаліся вобразы і тэмы, ідэі і інтанацыі.

У.Жылка – адзін з беларускіх паэтаў, чый трагічны лёс яскрава сведчыць аб складанасці і драматызме эпохі. Пісьменнікам гэтага змрочнага часу рэпрэсій і жорсткай цэнзуры даводзілася ісці на разнастайныя «ўлоўкі», каб мець магчымасць выказаць свае думкі і, адначасова, не выклікаць падазрэння з боку ўлады. «Паэт прырастаў сэрцам давызваленчага руху» [2, с. 32]. Ён даволі крытычна адносіўся да паслярэвалюцыйных падзей у Беларусі, закладваў у аснову сваіх лірычных твораў канцэпцыю рэчаіснасці, трагедыйную ў сваёй аснове, што шырока адлюстравана ў сімвалічных вобразах прыроднай стыхіі. Практычна кожны другі ці трэці верш з кнігі «Выбраных твораў» (1998) згадвае адну або некалькі з'яў прыроды. Так, заўважым, што ў лірычных творах У.Жылкі сустракаецца вобраз ветру (42 разы!), буры (13), віхуры (12), туману (15)[2]. Іншыя прыродныя з'явы ўзгадваюцца паэтам значна радзей: гром – 6, пярун – 3, дождж – 4, завея – 7, завіруха – 3, сцюжа – 3, мяделіца – 1, маланка – 3, бліскавіца – 4, навальніца – 3 разы. Відавочным з'яўляецца тое, што разнастайныя прыродныя стыхіі аказва-

---

[1] Звернем увагу, што ў творчасці У.Жылкі ёсць два вершы з аднолькавай назвай – «Восень». Гэтыя вершы напісаны ў розныя гады – 1924, 1925.

[2] Падлік праводзіўся па кнізе: Жылка У. Выбраныя творы. – Мн., 1998.

Могилевский государственный университет имени А. Кулешова

юцца ўцягнутымі ў вір сацыяльных праблем, праз іх мы ўспрымаем надзейны клопат лірычнага героя таго часу, душэўны і фізічны стан мастака слова. Адносіны паэта да прыродных вобразаў-сімвалаў выяўляюцца нават у загалоўках твораў: «Вецер», «Віхор», «Чырванее заход ад марозу», «Туман», «Устае туман бялявы». Напэўна, не з'яуляецца выпадковым і тое, што многія аўтары таго часу захапляліся разбуральнымі прыроднымі стыхіямі.

Бяспрэчна, у паэта ёсць, на першы погляд, чыста пейзажныя вершы, напрыклад, «Восень» (1924), «Зімовае», «Нібы вялізны чорны птах», «Чырванее заход ад марозу», «Туман», з якіх перад намі паўстае то вецер, то восень з яе дажджамі і прахалодай у анімістычным адлюстраванні. І.Навуменка сцвярджае, што ў згаданых вершах «тоны прыглушаны, няма нічога крыклівага, апрача даверлівай інтанацыі, выверанай адпаведна матыву радка, праўдзівасці малюнка, дэталяў. Яшчэ ідуць баі, сходзяцца ў кровапралітных сутычках непрымірымыя варожыя станы, але паэт нібы не чуе нічога, ён як бы знаходзіцца па-за часам і прасторай, чуе, адчувае толькі вецер, бачыць «неба сіняе», «зорную выш» расу, туман» [4, с. 679]. Дазволім сабе не пагадзіцца з апошняй думкай. Па-першае, з гэтых вершаў павявае змрокам і трывогай, неспакоем і холадам, што выклікана сумным настроем паэта ад падзей у краіне, яго самаадчуваннем і вымушанымі эміграцыямі. У лісце да Л.Сілаевай (1923 – 1924) паэт напіша, што «пераважаючы настрой – Ночы і Смерці. І хачу філасафічна падвохамі апраўдаць і ацаніць іх. Адсюль і тэмы пісаніны (пішу рэдка і выпадкова). <...> Калі нахлыне ўсялякая чартаўшчына, хочацца забіцца ў вугал і ўпарта маўчаць. Вось, магчыма, сапраўдная прычына, пра яе пісаў табе. Але адкуль гэта? – спытаеш. Што я ведаю? А магчыма, не пад сілу эмігрантчына, што здароўе кепскае, а магчыма... ўсё магчыма! Па радзіме сумую да болю. Так хацелася б быць дома, сярод свайго народа, дыхаць сваімі прасторамі, сваім небам захапляцца» [1, с. 253]. Ці можна назваць гэты сум пазачасным? Па-другое, прырода ў мастака слова адухоўленая, яна жыве сваім, непадуладным палітычным падзеям жыццём, ці не гучыць гэта кантрастна ў адносінах да жыцця чалавека, які з'яўляецца часткай гэтай прыроды? Па-трэцяе, напрыклад, верш «Туман» быў напісаны ў лютым 1922 года. Ці не дзіўна, што зімовы час навявае не зімовы ці вясенні (радасны, светлы) пейзаж, а халодны туман, што «Быццам цяжкі грэх жыцця, // На сэрца лёг жудою // І яснасць дум і пачуцця // Прыкрыў, халодны, ён сабою» [1, с. 40]?

У народзе кажуць: «У кожнага ветру сваё надвор'е», «Адкуль вецер, адтуль і надвор'е» ці нават «Вецер-гаспадар». Магчыма, кіруючыся гэтай народнай мудрасцю, У.Жылка так грунтоўна раскрыў ролю ветру, адвечнай рамантычнай стыхіі, як *прадвесніка жыцця беларусаў у 20 – 30 гг XX ст.* Паэт семантычна пашырае вобраз ветру ў параўнанні з фальклорным. У творчасці У.Жылкі ён, у першую чаргу, *свежы, лёгкі, распачны, салодкі, дыхлівы,* таму найчасцей ён апякае прыроду, вітае, падтрымлівае жыццё: *здзьмухвае пыл вясковы, спявае, дрэмле між хваль, нясецца, звініць ля вушэй* і аўтар ласкава называе яго *ветрыкам* (7 разоў), што *павеяў свяжэй*[3]. У лірыцы ж П.Труса вецер найчасцей *буйны.* Заўважым, што творчасць У.Жылкі традыцыйна падзяляюць на тры перыяды: заходнебеларускі (віленскі) – да 1923 г., чэхаславацкі – з 1923 г. і савецкі – з 1926 г. Пры гэтым адзначым, што кожны з іх мае свае

---

[3] Для параўнання звернемся да лірыкі П.Труса. «У яго адлюстраванні вецер найчасцей *буйны* (13 разоў, а ў творах У.Жылкі ён такім зусім не з'яўляецца), таксама ён можа быць *буяным, дзікім, ніцым, асеннім, свежым, лёгкакрылым.* Неабходна адзначыць, што ў П.Труса сустракаем своеасаблівыя тыпы ветру: *ветры-завірухі, ветры-буры, ветры-ветравінні, вятры-ўзвеі, вятры-сокалы, вятрынь, ветравей, ветрасінь.* Пры гэтым з 92 разоў, што ўзгадваецца вецер, усяго 2 разы – гэта *вецярок,* пры чым адзін з іх – *вецярок помсты* (Падлік праводзіўся па кнізе Трус П. Выбраныя творы. – Мн., 2000.).

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

адметнасці ў адлюстраванні прыродных стыхій. Адны і тыя ж з'явы ў залежнасці ад абставін могуць мець рознае семантычнае значэнне. Так, пачынаючы з 1926 г., вецер у паэта становіцца часцей злой, цяжкой прыроднай стыхіяй: *злым, прарэзліва-дзікім, лютым, паганым, неспрыяльным,* што *свішча, хвошча, галосіць, скавыча* (вецярок жа ні разу не ўзгадваецца), бо ён з'яўляўся ўвасабленнем сацыяльнага зла ці разбуральнай сілай. Гэту думку пацвярджае У.Калеснік, адзначаючы, што «ў вершах 1926 года мы назіраем працэс урбанізацыі мастацкага ўспрымання і выхад паэта насустрач чэшскай пралетарскай паэзіі. Паэт творыць свае вобразы з жыццёвых супярэчнасцей буржуазнага горада і са злыбед эмігранцкага жыцця. Ён нават лічыць, што ў гэты час рамантызм як сістэма творчай трансфармацыі рэчаіснасці стаў для яго пройдзеным этапам» [2, с. 180]. Відаць, таму У.Жылка часам вецер называе *сіверам злосным,* што «вее млосна, міма ймкне, «ці *злым сухавеем, вятрыскам злым,* (эпітэт – *злы* – сустракаецца ў кожным выпадку). Відавочна і тое, што ў двух папярэдніх перыядах творчасці паэт захапляецца рамантычнай стыхіяй, стварыўшы выразнае міфалагічнае аблічча ветру-героя. Стаўшы злым, прарэзліва-дзікім, вецер больш не з'яўляецца цэнтральным героем пейзажных твораў У.Жылкі.

«Паэта вабілі людзі, што змагаліся з ворагам, ён, як умеў, славіў усенародны вызваленчы рух супраць белапольскай акупацыі», – сцвярджае І.Навуменка [4, с. 674]. Таксама У.Жылка да апошняга верыў у магчымасць незалежнасці Беларусі, у часовасць «злога ветру», пад якім, відаць, увасабляе сталінскі рэжым з яго таталітарнай сістэмай. Вобразы змагароў у лірыцы паэта не выразныя: часам чытач сустракае лірычнае «мы», часам «я», і тады гэта «я» акружана злосна-грозная ці халоднай прыроднай стыхіяй. Верш «Над нядоляй Тваёй не заплачу...» – яскравы таму прыклад. У ім аўтар параўноўвае вызваленчы рух і зімовы вецер, што знаходзіцца ў стане крайняй безнадзейнасці, упадку і прыходзіць да высновы:

Дык ці ж мне выгалошваць жывому,
Запяваць паніхіднае мне?
А ніколі, ніколі, ніколі:
Мы – не вецер распачны зімой [1, с. 66].

Дзённікавыя запісы, лісты дапамагаюць глыбей зразумець творчасць паэта, істотна дапаўняюць наша ўяўленне пра майстра паэтычнага слова. Напрыклад, у лісце да А.Луцкевіча ад 22 студзеня 1926 г, ён пісаў: «...я хачу быць чэсным паэтам, а не пець, што «як пан кажа» [1, с. 275]. Відаць, за чэснасць, адкрытыя думкі У.Жылка на сабе паспытаў «клопат роднай дзяржавы». Аб перажытых выпрабаваннях лёсу ён пісаў у аўтабіяграфічнай паэме «Тастамент»:

Яна [вера – Ц.Ж.] была мне праз гады
Хлапцу і сталаму спамогай,
Хоць і губляў свае сляды
У завеях ветру злога [1, с. 143].

Разнастайныя з'явы прыроднай стыхіі, адлюстраваныя У.Жылкам, дапамагаюць паўней зразумець бунтарскі дух паэта-адраджэнца, яго палымяную грамадзянскасць, імкненне жыць сваімі поглядамі, прагу ісці сваёй незалежнай сцежкай у жыцці, не прыстасоўвацца да ўмоў.

Нарадзіцца У.Жылку пашчасціла непадалёк ад вядомага ўсяму свету Мірскага замка, вежы якога пакуль яшчэ велічна ўзвышаліся над ваколіцай. Таму яго непакоіў лёс «сцен зруйнованых замковых». Аб рэстаўрацыі тады гаворка ісці не магла. У нейкай ступені гэту справу, па словах паэта, выконвае вецер, бо ён – вечны, ён – сведка гісторыі. Ён, як зазначае аўтар у вершы «Замчышча», адзіны «здзьмухваў пыл вясковы», каб захаваць для нас гэты старажытны помнік гісторыі, каб расказаць нашчадкам, што «Тут князь калісьці жыў багаты, ганаровы // І слава-чутка йшла аб ім у свет далёкі» [1, с. 28]. Вецер у дадзеным выпадку выступаў своеасаблівым *адраджэнцам гісторыі.*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

У народных уяўленнях вецер часта выконвае ролю *сябра-вешчуна,* дапамагае чалавеку ў адказныя моманты жыцця, бо яго голас можа трапіць туды, куды не пад сілу пранікнуць чалавечаму слову. У часы адчаю, безвыходнага становішча (паэт, цяжка хворы на сухоты, быў асуджаны да пяці гадоў турэмнага зняволення) ён надзяляе вецер сілай, здольнай пераносіць просьбу праз пэўную адлегласць:

З прыродай зліцца я гатоў,
Хай прыме дол сухое цела,
Але прашу яе вятроў
Мой запавет, як дол даспелы,
Да родных данясці палёў [1, с. 145].

Часам у творах У.Жылкі вецер выступае ў якасці *суразмоўцы.* Перад вершам «Запытаў я моркі хвалі...» (1926 г.) паэт пазначыў: «Перайманне». М.Скобла (аўтар прадмовы і каментарыяў «Выбраных твораў» У.Жылкі) адзначае: «Узор пераймання высветліць не ўдалося» [1, с. 321]. У згаданым вершы мы назіраем адухаўленне прыроды, рытарычныя трохразовыя звароты-пытанні, лексічныя паўторы, характэрныя для фальклорных твораў. Лірычны герой звяртаецца да персаніфікаваных сіл прыроды: хваляў, ветру, Сонца, як да жывых істот, якія могуць не толькі размаўляць, а нават з'яўляюцца *дарадцамі-прарокамі.* Хутчэй за ўсё гэтае перайманне ідзе з вуснай народнай творчасці:

Запытаў я ветра ў полі:
– Адкажы мне, калі можаш,
Як пазбыць жыцця нядолі?
І пачуў: «Змагайся – зможаш» [1, с. 100].

Верш «Вецер» [1, с. 39] на першы погляд – чыста пейзажная замалёўка, пабудаваная пры дапамозе прыёму кантрастаў. Аднак пры ўсёй выразнасці створаных у ім малюнкаў, пры ўсёй адухоўленасці, якая дасягаецца багатай колькасцю моўных сродкаў, вобразы-сімвалы нясуць своеасаблівы падтэкст. Першая страфа верша напоўнена радасным, бадзёрым, імклівым настроем, бо вецер, уварваўшыся праз весніцы, «Вер, што жаданае здзейсніцца» // Ласцячы вуха, шалнуў». У другой страфе вецер быццам увасабляе маладосць і яе энергічны рух:

Шпаркі і лёгкі ў захопленні,
Лёгка праскочыў праз плот,
Штось зашумеў між каноплямі,
Борзда мінуў агарод.

У наступнай страфе вецер-свавольнік нагадвае гарэзлівае дзіця, якое не заўсёды адрознівае карысныя забавы ад шкодных. Ён, адчуваючы ўсёдазволенасць і сілу, «блытаў, віхрыўся дурніцаю» на збожжавых палях, што ўжо само па сабе не можа выклікаць адабрэнне. Далей аўтар паказвае нам зусім іншы вецер – палахлівы, слабы і нават бяссільны, ён «Лесу пабачыўшы цёмнага // Хмура-задумны аблік, // Быццам спужаўся таёмнага, // Сцішыўся, зменшыўся, знік...».

Варта задумацца над асацыятыўнай сувяззю паміж вобразам ветру і згаданым вобразам лесу, што з'яўляецца сімвалам вечнасці, жыцця. У часы язычніцтва, наогул, людзі маліліся дрэвам, лічылі іх багамі. Цяжка адназначна сцвярджаць, што ў дадзеным выпадку хацеў сказаць паэт. Інтанацыя недагаворанасці дае падставу наступным меркаванням: або гэта вецер перамен, які толькі набірае моц, таму перад мацнейшай сілай (таталітарнай сістэмай і яе «правасуддзем») пакуль вымушаны сцішыцца, знікнуць, або пад ветрам ён увасабляе падхалімаў і двурушнікаў, якія вымушаны перад мацнейшай сілай «зменшыцца, знікнуць». У дадзеным выпадку не бярэцца пад увагу сімволіка лесу, але лірычныя творы і дзённікавыя запісы У.Жылкі сведчаць, што ён дастаткова добра ведаў беларускі фальклор.

Глыбінным пераасэнсаваннем з'яў прыроднай стыхіі паэт займаецца і ў час тугі і *сумнага настрою.* Сум, па-першае, яму заўсёды навявала хвароба, што не давала спакою ні ў Вільні, ні ў Празе, ні на Радзіме, і тым больш у холадзе Уржума.

Могилёвский государственный университет имени А.А. Кулешова

Вось толькі некалькі радкоў з яго «Дзённіка»: «Як пагана чуць сябе хворым, слабым, няпрудкім на нагах. Ходзіш, хістаешся, і ўсё ў нейкім *тумане:* [тут і далей курсіў наш – Ц. Ж.]. І нічога, нічога не ведаеш, што дабро і што зло і куды ісці, калі ноч і бездарожжа? Калі цёмна і холадна? А галава як волавам налілася, і думка такая тупая і непаваротная. Цяжка не жыць, а па-скацячы бытаваць...» [1, с. 158]. Унутраны стан чалавека заўсёды залежыць ад фізічнага, аб чым паэт у 1923 г. пісаў: "«І калі не стане змогі працівіцца ці паху, ці мо ўжо самому сабе (адкуль ведаць?), калі воля, як пабіты *бураю* квет, ціха, бяссільна [неразб.] дзесь, у далёкім куточку, то гэта настане час твайго паніжэння, падзення, ганебны час. І ці можна быць светлым, калі тваё жыццё як хаўтурны матыў?» [1, с. 159]. Відавочна, што нават у эпісталярным жанры У.Жылка не абыходзіцца без вобразаў прыроднай стыхіі, і найбольш прыдатнымі для выяўлення настрою чалавека з'яўляюцца, на яго думку, вецер, туман. Па-другое, паэта не маглі не хваляваць палі-тычныя і сацыяльныя праблемы краіны, таму ў лірычных творах ён таксама шырока выкарыстоўвае для гэтай мэты сімвалічныя вобразы прыроднай стыхіі. Чытач, з аднаго боку, часта сустракае змрочны восеньскі ці марозны зімовы пейзаж, з другога – журботны, змротны настрой лірычнага героя. Верш «Чырванее заход ад марозу...» – яскравы таму прыклад:

Быццам чорная думка, з пагрозай
Змрок паўзе, выглядае з-пад стрэх.
К ночы вецер падняўся ў боры
І бушуе з канца ў канец [1, с. 34].

Такім чынам, У.Жылка даволі поўна і шматгранна, часам своеасабліва, адлюстраваў такую прыродную стыхію, як вецер. Яго ж найбольш моцныя праявы – віхор і бура – у адлюстраванні паэта маюць не менш цікавы характар. Часам яны сугучныя ветру, бо, не дарэмна, у народзе кажуць: «Вецер, віхор і бура – тры родныя браты». Яны з'яўляюцца не толькі прыроднымі стыхіямі, але таксама сімвалізуюць рух, змаганне, пэўныя перамены, хоць, паводле павер'яў усходніх славян, віхор атаясамліваўся з дзейнасцю нячыстай сілы, чортавым вяселлем ці самагубствам каго-небудзь. Таксама на Беларусі лічылі, што «для большай вясельнай урачыстасці і самыя стыхіі прыходзяць на дапамогу: дождж, слота і вецер, якія пераходзіць у жорсткую віхуру і ўраган, суправаджаюць чортаў вясельны рух, прычым, па ступені стыхійных праяў можна вызначыць і ступень рангавага становішча жаніха нячысціка, бо вяселле ўбогага імчыцца ў простай лёгкай віхуры. Першаразраднага ва ўрагане» [5, с. 18]. У паэта ж віхор часцей *гонкі, гучны, звонкі ў белай (а не чорнай) цьме,* часам бывае *непрыветным, сваволььнм.* Часам паэт, выкарыстоўваючы вобразныя *сродкі,* слоўнае і рытміка-інтанацыйнае афармленне, дапамагае нам не толькі ўбачыць, але і пачуць «віхур сваволььны звон». Верш «Віхор» (1922) называлі змагарскім, атаясамліваючы яго з рэвалюцыяй. Але так успрымаецца твор толькі пры павярхоўным азнаямленні.

Паспрабуем больш удумліва ўчытацца ў радкі верша. Як адзначае М.Скобла, паэт, жывучы ў цэнтры горада, паблізу цяперашняй Плошчы Свабоды ў 1917 годзе, меў магчымасць ледзь не штодня назіраць шматлюдныя мітынгі. Як назіральнік трапіў У.Жылка і на Першы ўсебеларускі кангрэс, у час якога бальшавікі ўварваліся ў залу і пачалі збіваць і арыштоўваць удзельнікаў. Гэта было ці не першае знаёмства паэта з беларускім нацыянальным рухам [1, с. 7]. Амаль у гэты час з'явіўся згаданы верш, як адзначае І.Навуменка, прысвечаны Ядвігіну Ш. [4, с. 676]. Але меркаванне даследчыка наконт прысвячэння не зусім доказнае. Дакладна толькі вядома, што надрукаваны верш у дзень смерці паэта. Наўрад ці мог у гэты час У.Жылка ўвасабляць рэвалюцыю пад вобразам віхра? Хутчэй за ўсё віхор у аднайменным вершы з'ўляецца сімвалам сацыяльнай

Могилевский государственный университет имени А.А.Кулешова

помсты, увасабленнем вызваленчага руху. У.Калеснік адзначыў, што «Віхор» – гэта найярчэйшы паэтычны вобраз тагачаснага *стану* заходнебеларускага жыцця, дакладней, вобраз духоўнага стану грамадства. Паэт трапна перадаў адчуванне грамадства, устрывожанага незавершанасцю гістарычнага працэсу» [2, с. 76]. Гэту ж думку падзяляе і І.Навуменка, адзначаючы, што «ўвогуле верш з'яўляецца паэтычным вобразам «барацьбянай Заходняй Беларусі, што апынулася пад пятой пілсудчыкаў» [4, с. 675]. Віхор у згаданым, ды і ў большай частцы вершаў паэта, велічны, з'яўляецца перш за ўсё ачышчальнай (жыццядайнай) стыхіяй. Пусціўшы па пушчах «песню-звон», ён набірае ўсё большы размах. Гэта меркаванне пацвярджаюць радкі верша: «*і не, не злы, але бушуючы, ў шалёным імпэце ўвесь ён*», або «*шляхі нямераныя цярэбяць нам віхры*» [1, с. 72]. Іншай сілай найчасцей паўставаў віхор у творах паэтаў гэтага часу. Напрыклад, у Я.Купалы чытаем: «Глядзі – во імчыцца – // Жыццю наперало́м – // Па полі, па пушчы // Віхор-буралом» («Заўсёды наперад»). У лірыцы П.Труса, што быў у адным узросце з У.Жылкам, жыў і пісаў у адзін і той жа час, віхор як прыродная стыхія практычна не паказаны. Разам з тым паэт выкарыстоўвае такія новатворы як *узвіхранае сэрца, мы віхрым, напевы мінуўшчыны віхрылі.* Таму яшчэ мацней здзіўляюць спалучэнні пэўных слоў, якія выкарыстоўвае У.Жылка для апісання гэтай стыхіі:

Гасцём і мараю трывожнаю
Зляцеў да нас з-пад самых зор.
Краінай любаю разложнаю
Імкне, гудзе, шуміць віхор.

Віхор у творах паэта адначасова з'яўляецца *гасцём і мараю трывожнаю.* Як вядома, «мара – ва ўсходнеславянскай міфалогіі – злы дух, увасабленне смерці, мору; бажаство зла і варажнечы; нябачная днём здань, якая робіць свае справы ноччу» [3, с. 103]. Загадкавым застаецца пытанне: якую ж мару ўзгадвае У.Жылка? Тлумачальны слоўнік беларускай мовы змяшчае тры значэнні: 1. *Вобраз, створаны ўяўленнем, фантазіяй; прывід, здань. 2. Думка пра жаданае, будучае. 3. Прадмет жадання*. Хутчэй за ўсё, паэт меў на ўвазе менавіта думку пра жаданае. Дарэчы, згодна з фальклорна-міфалагічнымі ўяўленнямі беларусаў, уся нячыстая сіла дзейнічае ноччу. У.Жылка часцей не ўдакладняе час разгулу разбуральных прыродных стыхій, гэтым самым набліжаючы іх да жыццядайных. Яны сімвалізуюць стваральныя, новыя, змагарскія сілы нацыянальнага адраджэння. Магчыма, паэт спалучае супрацьлеглыя рэаліі, каб сказаць, што віхор з'яўляецца госцем для вызваленчага руху і, адначасова, смерцю для белапольскіх акупантаў. Не толькі прырода, але і чалавек натхняецца гэтым размахам. У.Калеснік адзначае, што «на лірычнага героя ён [віхор – Ц.Ж.] дзейнічае як магутны ўзбуджальнік духоўнай энергіі» [2, с. 76]. Незвычайная парадаксальная карціна ствараецца ў апошніх радках:

Дзе йдзён? І дзе капцы канцовыя?
Дзе ходу нашаму мяжа?..
Ў адказ віхор пяе ўсё новае,
І лязіво бліскучыць нажа! [1, с. 36].

Што меў на ўвазе У.Жылка, узгадваючы нож?[4] Згодна з фальклорна-этнаграфічнымі запісамі, нажом знішчалі чортава вяселле, раптоўна падстаўляючы яго пад вузел віхуры. Мяркуем, што нож у дадзеным выпадку сімвалізуе зброю як сродак абароны ад цёмнай зямной напасці, бо «Адважны хто спыніць намерыцца // Размах жыцця і творчы пыл?..» [1, с. 35].

---

[4] Дарэчы, У.Жылка час ад часу ўзгадвае такія віды халоднай зброі як меч ці нож. У фальклорных жа творах часта сустракаем такія віды зброі як булава ці сякера, што лічылася прыладай пакарання сіл прыроды. Відаць, гэта вынік творчага пераасэнсавання паэтычнай спадчыны продкаў.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Часам паэт узгадвае віхор як *свавольную,* нават *разбуральную ці знішчальную* сілу ўсяго шкоднага, што перашкаджае Беларусі на шляху да свабоды і незалежнасці. Заўважым, што такое ўвасабленне часцей сустракаем у савецкім перыядзе творчасці. Пры гэтым звяртае на сябе ўвагу наступная акалічнасць: У.Жылка даволі «суха» падае такі віхор, ён пазбягае выкарыстання вобразных сродкаў для яго апісання – эпітэты зусім адсутнічаюць (гэта ж самае датычыць і вобраза буры). Неабходна адзначыць, што для беларускай літаратуры 30-х гадоў XX ст. характэрным было зніжэнне ўвагі да прыродаапісальных малюнкаў. Магчыма, пад уплывам гэтай «моднай» тэндэнцыі, У.Жылка, калі і згадваў віхор у савецкім перыядзе творчасці, то найчасцей звяртаў увагу на яго дзейсную сілу: *грукае, гудзе, ламае, узрывае.* Ён часцей ужо ўвасабляе моцную, але не ўсемагутную сілу, над якой вызваленчы рух павінен атрымаць перамогу, праўда, часам у сваіх думках-малітвах паэт спадзяецца, «каб жа Бог // Дапамог!...».

У вершы «На эміграцыі» У.Жылка згушчае фарбы, паказваючы шматлікія вобразы-сімвалы, сярод якіх сустракаем зусім іншы віхор – ён выступае ў якасці *знішчальнай сілы,* пад якой згадваецца дэспатычны і тыранічны сталінскі рэжым, што валадарыць над светам. Гэта сведчыць пра чыста фальклорнае перайманне, дзе віхор «асэнсоўваўся як праяўленне дзейнасці нячыстай сілы» [3, с. 41]:

Калі віхор гудзе без ладу
І к радасці замёў сляды [1, с. 97].

Ўзняліся магутна ў віхрах непрыветных,
Каб скінуць вяковыя рабскія ёрмы [1, с. 107].

І.Навуменка называе віленскія вершы паэта «часам шурпатымі, узвіхранымі» [4, с. 677]. Магчыма, падставу так меркаваць даследчыку дае той факт, што вобраз віхору найбольш адпавядае гэтаму перыяду творчасці. Не выключана, што інтанацыйна-сінтаксічная арганізацыя многіх вершаў віленскага і савецкага перыядаў творчасці таксама з'яўляецца доказам таму (сустракаем шматлікія паралелізмы, інверсіі, абрывы, дзякуючы чаму словы ў радках гучаць адрывіста, заклікаюць чытача да разнастайных разважанняў і асацыяцый).

Часам душэўныя перажыванні паэта выяўляліся ў складаных, нават супярэчлівых матывах і вобразах. Вобраз буры – адзін з іх. У перыяды пагаршэння здароўя У.Жылку нават хацелася памерці (дарэчы, смерць – даволі распаўсюджаны матыў творчасці), але ён усё ж такі імкнуўся перамагчы гэты песімістычны настрой, і бунтарскія інтанацыі гучалі з яго твораў.

Часам паэт атаясамлівае буру *з тагачасным жыццём.* Таму творы паэта прасякнуты марай і надзеяй пра спакой і незалежнасць: «Бязбурны дзень – вачэй затокі. // Мне люба сніць (бязбурны дні!)». Але час, у якім ён жыў, не даваў магчымасці забыць пра змаганні, барацьбу, таму, у першую чаргу, – гата сімвал *барацьбы і аднаўлення:*

Буры пара б нагадаць
Шэрасць дакучлівых хмар.
Сэрца прыждала жадаць,
Гасне паволі пажар [1, с. 43].

У вершы «Запытаў я морскі хвалі...», блізкім па гучанні да народнай песні, лірычны герой-пакутнік, шукаючы шчасце, знаходзіць адказ, што «Радасць – толькі ў бурах?» [1, с. 100].

У. Жылка ні разу не апісвае буру як разбуральную сілу ў яе асноўным значэнні, няма таксама асобнага верша, прысвечанага гэтай стыхіі, ён толькі апасродкавана ўказвае на яе магутную сілу і размах: «Нібы сонцам зямля пасля буры // Я асвечан маім пачуццём» [1, с. 56].

Верш «Песня дзесятых угодкаў» (1927), на першы погляд, вылучаецца сярод іншых сваім інтанацыйным гучаннем, бо змяшчае ў сабе хвалебна-ўрачыстыя заклікі:

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

«Спявайце, браты, нашае Сёння», не характэрныя для творчасці паэта. Але занадта ўражваюць наступныя словы-думкі: адмаўляючы ўсё змрочнае ва *Ўчора,* увасабляючы яго пад вобразамі прарэзліва-дзікага ветру, холаду, голаду, непрыветнага віхру, паэт верыць у светлае Заўтра, *дзе зззяе маяк перамогі агністай.* У той жа час ён адзначае, што *крок наш стаў павольней, марудней,* а праца – пчалінай.

Таму гэта гімн не толькі рэвалюцыйным зменам, што адбыліся, але і даволі адкрытыя для таго часу думкі-планы наконт будучага. Аўтар верыць «ўсёй шчырасці словаў паэты», што «за труднымі днямі – канцовая мэта?».

У.Жылка шырока выкарыстоўваў сімволіку буры і ва ўласнай перапісцы, часам прама ўказваючы на яе значэнне: *бура рэвалюцыі.* Напрыклад, у лісце да Л.Сілаевай (1922) чытаем: «І яшчэ тыя, хто пасля Кастрычніка вытрымаў выпрабаванне голадам, разрухой, эпідэміяй у навальніцы і буры рэвалюцыі, не вытрымалі перад часам. Адсюль нэп» [1, с. 252].

У асноўным паэты 20-х гадоў XX ст. увасаблялі рэвалюцыю пад вобразам буры. У творчасці П.Труса гэта бура-рэвалюцыя «крышыць нежывое» [7, с. 86], таму яна найчасцей *віхрыстая, грозная,* але лірычны герой захапляецца такой бурай, аб чым сведчаць наступныя радкі: «стой смела ў бураломе», «у бурах акорды мелодый», «кручы бур-навальніц», «прасторы бур». Ва У.Жылкі бура барацьбы і адраджэння яшчэ толькі наспявае, таму, праводзячы аналогіі паміж прыроднай і сацыяльнай бурай, ён выяўляе яе пакуль толькі *пагрозлівай.* Паэт адчувае, што нацыянальны рух 1917 – 1918 гадоў затухае, і Беларусь страціла сваю незалежнасць. Таму, відаць, пад бурай У.Жылка ўвасабляе адкрытае выступленне супраць улады.

Як бачым, паэт творча пераасэнсоўваў павер'і ўсходніх славян, пашыраючы іх гучанне. Вобразы ветру, буры віхуры, занялі значнае месца ў яго паэтычнай спадчыне, штосьці са згаданых вобразаў мы ўспрымаем з лёгкасцю, пэўныя моманты патрабуюць яшчэ ўважлівага прачытання.

Відаць, таму ў аўтара, прыхільніка агульначалавечых гуманістычных памкненняў, у першых двух перыядах творчасці пераважае спакойны, хоць часцей сумны, характар прыродных стыхій. Пачынаючы з 1926 г, адлюстраванне ветру, буры, віхуры істотна змяняецца. Вецер найчасцей становіцца злым, лютым, паганым (ёсць *вятрыска,* але ён *жудасна вые*). Усё больш часта ўспамінаецца бура з маланкамі і перунамі. Радзей згадваецца жыццядайны дождж. Заўважаецца і тое, што мова паэтычных радкоў У.Жылкі даволі арыгінальная. Асабліва звяртаюць на сябе ўвагу параўнанні. Часам аўтар выкарыстоўвае сталыя параўнанні *(конь, нібы вецер, нясецца; а вочы з-пад павек – з-за хмар зарніца),* найчасцей жа – даволі своеасаблівыя, аўталагічныя: *«санет гучны, нібы віхор свавольны ў буру»* [1, с. 31]; *«слова грукае, нібы віхура аб шыбы»* [1, с. 86]; *«нібы сонцам* зямля *пасля буры, я асвечан маім пачуццём»* [1, с. 56]; *«быццам ветрык, згадкі зблудзіліся»* [1, с. 55]; *«як жудасна вятрыска вые, нібы над згубаю маёй «* [1, с. 97], але ўсе яны дапамагаюць ярчэй уявіць вобраз, створаны паэтам, прымушаюць задумацца, адчуць шырыню вобразнай сістэмы, носяць умоўна-пераўвелічальны характар. Таксама не забывае звяртаецца да маштабных абагульненняў, выкарыстоўваючы псіхалагічны сінтаксічны паралелізм у многіх вершах.

Падагульняючы высновы, адзначым, што У.Жылка, абапіраючыся на традыцыйны светапогляд нашых продкаў, стварыў своеасаблівыя, непаўторныя і запамінальныя, вобразы прыроднай стыхіі. Ён надзяліў іх жывой сілай і душой, характарам і манерай паводзін. Як рамантык, паэт пераасэнсоўвае і пашырае дуалістычны характар паводзін прыродных стыхій, адлюстраваны ў фальклорных творах. Захоплены размахам ветру, буры, віхуры, У.Жылка зрабіў іх сімваламі вызвален-

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

чага руху, змагання, імкнення наперад да незалежнасці Беларусі. Пры гэтым натуральным з'яўляецца залежнасць характару прыродных стыхій ад самаадчування паэта, яго душэўнага стану і месцазнаходжання. Але, незалежна ад гэтага, У.Жылка заўсёды, відаць, спадзяваўся на станоўчае вырашэнне пытанняў адносна самастойнасці і незалежнасці Беларусі. Таму гэтыя вобразы, у першую чаргу, уяўляюць сабою стваральныя, жыццядайныя сілы, якія могуць выступаць і ўвасабленнем зла, разбурэння, нават усеагульнага знішчэння.

### ЛІТАРАТУРА

1. ***Жылка У.*** Выбраныя творы. – Мн., 1998. – 358 с.
2. ***Калеснік У.*** Ветразі Адысея. Уладзімір Жылка і рамантычная трагедыя ў беларускай паэзіі. – Мн., 1977. – 327 с.
3. ***Коваль У.І.*** Народныя ўяўленні, павер'і, прыкметы: Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі. – Гомель, 1995. – 180 с.
4. ***Навуменка І.Я.*** Уладзімір Жылка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. Т. 2 / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літаратуры імя Я.Купалы. – Мн., 1999. – С. 673-689.
5. ***Никифоровский Н.Я.*** Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. – Витебск, 1995.
6. ***Никифоровский М.*** Русское язычество. – СПб., 1875.
7. ***Трус П.*** Выбраныя творы. – Мн., 2000. – 384 с.

### SUMMARY

*The attempt to find out the influence of folklore traditions upon the literary work of the Belarussian poet V. Zhylka has been made by the author. It was detemined that the poet resorted to symbolic wind, storm and thunderstorm in certain socio-historic and psychological situation.*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова